# Забыць не маю права

***У Беларусі наўрад ці знойдзеш сям'ю, якую б Вялікая Айчынная вайна абыйшла бокам. Мы заўсёды будзем памятаць бацькоў, дзедаў, якія выстаялі пад жудасным націскам фашысцкіх захопнікаў, тых, хто цаною свайго здароўя і жыцця заваяваў шчаслівы сённяшні дзень, адбудаваў зруйнаваную Айчыну.***

Івана Ісакавіча Кундзікава я ўпершыню ўбачыла на мерапрыемстве ў цэнтральнай бібліятэцы, прысвечаным 65-й гадавіне Вялікай Перамогі над Германіяй. У апублікаваным у раённай газеце матэрыяле быў змешчаны невялікі ўрывак з яго ўспамінаў пра апаленае вайною юнацтва:

-15 чэрвеня 1941 года я скончыў 9 класаў з пахвальным лістом, - пачаў свой аповед пры нашай сустрэчы І.І. Кундзікаў. – А ўжо 22 чэрвеня зямля ўздрыгнула ад разрываў гітлераўскіх бомбаў і снарадаў. Бацьку адразу прызвалі ў дзейнічую армію (родныя дадому яго так і не дачакаліся). З хвораю маці засталося нас 7 дзяцей. А ў хуткім часе ў нашай вёсцы Драчкова, што ў Чавускім раёне, з'я-

- У той дзень мяне накіравалі накапаць у вёсцы бульбы, - расказвае далей Іван Ісакавіч. – А здарылася бяда. Тую мясціну, дзе мы хаваліся, акружылі захопнікі і ўсіх перастралялі. Выходзіць, што Бог мяне мілаваў. Пазней расстраляных пахавалі ў брацкай магіле.

Але ж данеслі і на яго. Арыштавалі. Дапытваліся: "Партызан?". А потым разам з іншымі арыштаванымі вялі цераз вёску. Маці ўбачыла, бегла ўслед, молячы здраднікаў адпусціць сына...

Тры месяцы амаль пад адкрытым небам знаходзіўся ў канцлагеры пад Магілёвам. Умовы былі жудасныя: паўраздзетыя, галодныя людзі, а сярод мірнага насельніцтва былі і чырвонаармейцы, балелі і паміралі. Увесь гэты час Іван думаў пра пабег. І зрабіў яго, але няўдала, бо хутка дагналі і зноў за калючы дрот. Моцна пабілі пры гэтым... А потым па лагеры пайшлі чуткі, што павязуць у другі лагер. У хуткім часе заштурхнулі ў таварныя вагоны. Нехта сказаў: "Нас вязуць у Асвенцым"...

***Рэд**. Гэты канцлагер быў сапраўднай фабрыкай па знішчэнню людзей і правядзенню розных вопытаў. Попел спаленых трупаў служыў угнаеннем. Кармілі пахлёбкаю з ачысткаў бульбы і бруквы. Сістэма апазнавальных знакаў – нумар на*

скага раёна. І трэба ж так было здарыцца, што натыкнуўся на немцаў у раёне горада Магілёў... Зноў таварныя вагоны бітком запоўненыя людзьмі. На гэты раз збегчы ўжо не змог. Людзей прывезлі ў Германію. Мястэчка называлася Сольбарг.

Памятае Іван Ісакавіч, як важны нямецкі баўэр хадзіў уздоўж знямоглых арыштантаў, выбіраючы тых, хто памаладзей ды памацней. Так апынуўся беларускі хлапец на адной з фермаў, дзе захоўвалася малочнае пагалоўе кароў. Праца цяжкая. Трэба было іх і карміць, і даіць, а пас-



небудзь былі не ў сілах. Часта цяпер думаю: як толькі вытрымаў цяжкую працу, уніжэнні, а іншы раз, моцныя пабоі. Спрабаваў збегчы, але не шанцавала...

Самым шчаслівым ён лічыць дзень, калі ў красавіку 1945 года ўбачылі англійскіх салдат. Яны аддавалі схуднелым людзям свае кансерваваныя прадукты. Менавіта тады "остарбайтары" упершыню за доўгі час паелі нармальную ежу...

У жніўні 1945 года І.І. Кундзікаў вярнуўся ў Беларусь. Пасля адпаведных праверак быў накіраваны ў Бабруйскі раён у вёску Вішнеўка. Там, на невялікім прадпрыемстве рабілі шпалы для чыгункі. Кватараваў у мясцовай жыхаркі. У яе была ўнучка Марыя, якую ён вельмі пакахаў. А праз тры месяцы, калі аб'явілі, што ён свабодны, маладыя ажаніліся. Разам пайшлі працаваць на торфапрадпрыемства "Тугаліца". Грузілі торф на вагонкі, якія па вузкакалейцы адпраўлялі ў Бабруйск на ЦЭЦ.

У 1952 годзе закончыў Іван Ісакавіч курсы электрыкаў для працы на электрафіцыраваных машынах па здабычы торфу. Калі ж у Маладзечанскім раёне адкрылася буйное прадпрыемства "Бярэзінскае" па здабычы торфу, Кундзікава з сям'ёю, а ў той час у іх ужо было трое дзяцей, накіравалі туды працаваць. Выдзелілі жыллё. Працаваў вельмі добра. Першае месца трымаў у 1955 годзе. Пражылі там чатыры гады.

А потым на сямейным савеце вырашылі паехаць у Клічаўскі раён, дзе Ганчанскае прадпрыемства адкрывалася. Там рабіў участковым механікам, потым начальнікам участка. Праз 17 гадоў падаліся ў горад Кіраўск, дзе глава сям'і стаў працаваць на меліярацыйным прадпрыем-

віліся акупанты. Быў прызначаны стараста. Знайшліся і такія вяскоўцы, што сталі паліцаямі. Гэтыя "служакі" выконвалі ўсе загады фашыстаў.

Маладога хлопца не пакідала думка пайсці ў партызаны (інфармацыя аб тым, што атрады партызан базіраваліся на тэрыторыі раёна, лічылася даставернай і была распаўсюджана сярод юнакоў і дзяўчат). Іван збіраў на месцах прайшоўшых баёў зброю і захоўваў яе ў тайніку.

Калі Чырвоная Армія наблізілася да Беларусі, немцы і іх памагатыя сталі лютаваць. Моладзь употайкі падалася ў лес хавацца. З імі і Іван быў. Не ведалі толькі, што адна жанчына, якая была лёгкіх паводзін, данесла на іх.

*руцэ, нашыўкі на вопратцы. Печы крэматорыя працавалі без перапынку. У суткі спальваліся тысячы людзей. Дымам завалаківала ўсё вакол. Тут усё было прадумана да дробязаў, з уласцівай фашыстам практычнасцю.*

- Мы змаглі, можна сказаць, цудам, пранесці праз дагляд невялікія рэжучыя інструменты, - уздыхнуўшы цяжка працягвае мой субяседнік. – Вось імі і зрабілі ў дзвярах вагона дзірку і адчынілі іх. Саскочыў, на хаду, разам з іншымі і я. Прыціснуўся да шпалаў, пакуль састаў праехаў, а потым, як мага хутчэй, пабег у лес. Схаваўся ў снезе. Мароз. Холад. Вопратка нікудышная. Не, думаю, лепш рухацца, а то змерзну.

Іван, абыходзячы населеныя пункты і шашу, дайшоў да Шклоў-ля расцёлаў – даглядаць маладняк. Працавалі ад ўсходу да заходу сонца. Карміў гаспадар дрэнна: кубак малака, разбаўленага вадою, і невялікі кавалачак хлеба. І прычым, толькі два разы ў дзень.

- Нас работнікаў, у баўэра было трое. Я, мужчына з Галандыі і немка, - пасля невялікай паўзы працягвае Іван Ісакавіч. – Даваў ён нам і выхадны, калі мы маглі крыху адпачыць, пахадзіць па мястэчку, толькі не вельмі далёка ад фермы. А яшчэ гаварыў, што за працу нам належыць у месяц па 20 марак. Толькі тых грошай ніколі не даваў, тлумачачы, што яны ідуць на пагашэнне розных штрафаў, маўляў, мы парушалі дысцыпліну і г.д. Мы разумелі, што немец усё прыдумваў, а зрабіць што-

стве. Быў і начальнікам аддзела кадраў, і майстрам. Адсюль і пайшоў на заслужаны адпачынак.

Кундзікавы выхавалі 6 дзяцей, дапамаглі вывучыцца. Дачка Тамара пражывае ў Маскве, сыны Аляксандр, Уладзімір, Юрый, Аляксей – будаўнікі.

Пасля смерці жонкі, вось ужо 11 гадоў, Іван Ісакавіч пражывае ў нашым гарпасёлку ў сваёй дачкі Раісы. Цяпер яе прозвішча Ганчарова.

- Мне хораша ў Раісы, а яшчэ вельмі прыемна, што яна паважаны чалавек у Хоцімску, - сказаў ён на развітанне.

**Наталля КАЦЯШОВА.**

**На здымку:** І.І. Кундзікаў.

**Кацяшова, Н. Забыць не маю права** : [успаміны Івана Ісакавіча Кундзікава, вязня канцлагера] / Наталля Кацяшова // Шлях Кастрычніка.— 2010.— 9 чэрвеня.— С.3.